пэўнай гістарычнай падзеі і было магутным сродкам эмацыянальнага і педагагічнага ўздзеяння на грамадзян. Паратэатральнасць у XVII–XVIII стст. стала своеасаблівым жыццёвым асяроддзем, прасякнутым тэатралізаваным этыкетам і бляскам багацця.


1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии 18 в. / Г. И. Барышев. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с. : ил.

2. *Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў / П. А. Гуд. – Мінск : ООО «Мэджик Бук», 2007. – 100 с., іл.

3. *Гусоўскі, М* Песня пра зубра / М. Гусоўскі. – Мінск : Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтр, 1994.

4. *Клімуць, Л. Я.* Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стагоддзях / Л. Я. Клімуць. – Мінск : Беларусь, 2013. – 127 с. : іл. – (Серыя «Беларуская гісторыя»).

5. *Котович Т. В.* Карнавал как принцип художественного мышления эпохи барокко на Беларуси / Т. В. Котович // Журнал научных разысканий о биографии, теоретическом наследии и эпохе М. М. Бахтина [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.nevmenandr.net/dkx/?y=1996&n=2&abs=KOTOVICH. – Дата доступа : 04. 09. 2015.

6. *Мальдзіс, А.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры 18 стагоддзя: нарысы быту і звычаяў / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 256 с.

7. *Matuszewicz, M.* Pamietniki Marcina Matuszewicza, kasztelana Brzeskiego-Litewskiego (1714–1765) / M. Matuszewicz. – Warszawa, 1876. T. 1-2, 3-4.

8. O'Connor Bernard, Pamietniki. – Цит. по: Wilinski S. U zrodel portretu staropolskiego, Warszawa, 1958.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**І. М. Цэван,**
*выкладчык кафедры псіхалогіі і педагогікі*


# УМОВЫ ЭФЕКТЫЎНАГА ФАРМІРАВАННЯ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ПАДЛЕТКАЎ У ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАХ

У пачатку XXI ст. у педагагічнай навуцы заўважна абудзіўся інтарэс даследчыкаў да праблемы фарміравання этнакультурных каштоўнасцей асобы. Актыўнае навуковае асэнсаванне феномену «каштоўнасці» характарызуецца наяўнасцю мноства розных падыходаў, навуковых напрамкаў, школ, методык і метадалогій у айчыннай і замежнай навуцы і адначасовай ад-

сутнасцю адзінага, дакладнага вызначэння сутнасці, спецыфікі і структуры дадзенага феномену.

Паняцце каштоўнасці прыйшло ў педагогіку з філасофіі, яно ахоплівае шэраг матэрыяльных і духоўных з'яў, якія служаць умовамі існавання чалавечага грамадства. Па звестках Д. Панціча, у навуковай літаратуры на сённяшні дзень зарэгістравана звыш 400 розных азначэнняў паняцця «каштоўнасці», якія вар'іруюцца ў залежнасці ад навуковай галіны, ад абранай канкрэтным аўтарам тэорыі і акцэнту ў апераналізацыі і вымярэнні [1, с. 24].

Каштоўнасная праблематыка адпавядае асноўным накірункам дзяржаўнай палітыкі ў вобласці ідэалогіі і нацыянальнай культуры. Так, у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь [3] адзначана: чалавек з'яўляецца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; кожны мае права на ўдзел у культурным жыцці; абавязак кожнага – берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [2] адзначаецца: дзяржаўная палітыка ў сферы адукацыі грунтуецца на прынцыпах прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, правоў чалавека, гуманістычнага характару; адбываецца дзейнасць устаноў адукацыі па ажыццяўленні выхавання, у тым ліку па фарміраванні ў грамадзян духоўна-маральных каштоўнасцей, грамадзянскасці, патрыятызму, адказнасці, працавітасці. Выхаванне грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы. Адукацыйны і выхаваўчы працэсы арганізуюцца на аснове культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры.

Звяртаючыся да паняцця «этнакультурныя каштоўнасці» з пазіцый педагагічнай навукі, мы разумеем яго як сукупнасць асобасных якасцей, якія ўключаюць каштоўнасныя свядомасць, адносіны, устаноўкі, арыентацыі, паводзіны чалавека ў дачыненні да такіх складнікаў этнічнай культуры беларусаў, як нацыянальная мова, народнае мастацтва, традыцыі, абрады, звычаі.

Адным са сродкаў фарміравання этнакультурных каштоўнасцей падлеткаў – удзельнікаў фальклорных калектываў – з'яўляецца ўдзел у міжнародных фальклорных фестывалях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Слова «фестываль» ад лацінскага festivus перакладаецца як «вясёлы», «святочны» і ў агульным сэнсе абазначае масавае свята, якое ўключае паказ дасягненняў у галіне музыкі, тэатра, кіно, эстрады, цырка [5, с. 398]. Міжнародных фестваляў па-за межамі Беларусі сёння вялікае мноства. Па звестках А. І. Гурчанка [1, с. 3], толькі Еўрапейскай асацыяцыяй фальклорных калектываў (EAFF) пры садзейнічанні ЮНЕСКА ў Еўропе штогод праводзяцца дзясяткі міжнародных фальклорных фестываляў, сярод якіх – Сусветны чэмпіянат па фальклоры «Euro Folk», Еўрапейскі тэлевізійны чэмпіянат «Euro Folk» і інш.

Праведзены намі аналіз работы больш як 40 дзіцячых фальклорных калектываў Мінска і Мінскай вобласці за апошнія 25 гадоў паказаў, што шэраг калектываў пастаянна бярэ ўдзел у міжнародных фальклорных фестывалях і фестывалях народнай творчасці па-за межамі Беларусі. Гэта міжнародныя фестывалі ў Польшчы («Страчаная музыка», Кракаў; «Найстаражытныя песні Еўропы», Люблін, «Зродліска», Сувалкі), Расіі («Маскоўскі карагод», Масква; «Кацілася торба», Кузняцоўск; «Чырвоная горка», Бранск; «Музыка для ўсіх», Масква), ва Украіне («Покуть», Харкаў; «Днепр-рака сяброўства», Кіеў), у Сербіі («Федрас», Мало-Црнічэ), Малдове (Фестываль нацыянальных культур, Кішынёў), Літве («Балтыйская муза», Вільнюс), Балгарыі («Новая хваля ідэй», Кранева), а таксама ўдзел у многіх іншых фестывалях краін Еўропы і свету.

Менавіта ў такіх паездках падлеткі – удзельнікі мастацкіх калектываў – маюць магчымасць для зносін з прадстаўнікамі іншых этнасаў. Яны адчуваюць калектыўную і мастацкую еднасць, а таксама этнакультурную адметнасць беларускай культуры, мовы, музычнага і танцавальнага фальклору, нацыянальных касцюмаў.

Такім чынам, адбываецца працэс фарміравання этнакультурных каштоўнасцей падлеткаў у полікультурным асяроддзі. Дзеці маюць магчымасць ідэнтыфікацыі сябе ў якасці прадстаўніка канкрэтнай этнакультурнай і этнамоўнай групы, успрымаюць замежныя мовы, далучаюцца да культуры іншых краін і народаў, усведамляюць сябе прыналежнымі да планетарнай культурнай супольнасці. Падлеткі таксама адчуваюць прыналежнасць да пэўнай этнічнай супольнасці з асаблівасцямі псіхалагічнага складу, усведамляюць сваё адзінства і адметнасць ад іншых этнічных супольнасцей. Этнапсіхала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гічныя характарыстыкі беларусаў (працавітасць, памяркоўнасць, адкрытасць і інш.) адчуваюцца больш харктэрна. Эмацыянальныя і эстэтычныя ўражанні падлеткаў узмацняюцца, фарміруюцца станоўчыя адносіны да нацыянальнай мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, адбываецца асэнсаванне значнасці і самабытнасці апошняй. З’яўляецца неабходнасць выхаду за рамкі абмежаванага культурнага вопыту, наладжвання міжкультурных зносін.

Падчас паездак на міжнародныя фестывалі ў падлеткаў назапашваецца станоўчы вопыт сацыякультурнай дзейнасці ў якасці ўдзельнікаў калектыву па засваенні, захаванні, стварэнні і распаўсюджванні каштоўнасцей беларускай матэрыяльнай і духоўнай культуры. Значна паглыбляецца ўласны этнакультурны вопыт асобы.

Такім чынам, у працэсе ўдзелу ў міжнародных фестывальных мерапрыемствах адбываецца фарміраванне этнакультурных каштоўнасцей падлеткаў – удзельнікаў фальклорных калектываў.



*Мал. 1.* Узорны ансамбль народнай песні і музыкі «Бараўлянская крынічка» ў Музеі народнай архітэктуры і побыту ў пасёлку Азярцо Мінскага р-на (2010). Фота з архіва А. Р. Горскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Гурченко, А. И.* Исполнительский фольклоризм в Беларуси на рубеже XX–XXI вв.: основные тенденции и особенности развития: автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.09 / Гурченко Алеся Ивановна. – Минск, 2013. – 25 с.
*2.* Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск : РИВШ, 2011. – 352 с.
*3.* Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск : Амалфея, 2005. – 48 с.
*4. Пантич, Д.* Конфликты ценностей в странах транзиции / Д. Пантич // Социологические исследования. – 1997. – № 6. – С. 24–36.
*5.* Фестываль // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Том 5. – Скамарохі – Яшчур / Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ. – 1987. – С. 398.



*Мал. 2.* Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь – фальклорны гурт «Берагіня» падчас выступлення на Міжнародным фестывалі «Інтэрфолк». Карагод-гульня «Трыфан» (2004). Фота з архіва М. А. Козенкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ